
Гарадская грамадска-палітычная газета

Бабруйскае жыццё

Выдаецца з лістапада 1918 года



№№130-131 (15834-15835) ПЯТНІЦА, 25 жніўня 2000 года. Цана 50 руб.

Навіны ● Факты ● Падзеі

ВЫЛУЧАНЫ КАНДЫДАТАМІ Ў ДЭПУТАТЫ

Штодня ў акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання сцякаецца інфармацыя аб ходзе вылучэння працоўнымі калектывамі кандыдатаў у дэпутаты ў вышэйшую заканадаўчую ўладу краіны

Як паведаміла сакратар камісіі па Бабруйскай выбарчай акрузе № 65 Л. Р. Геніеўская агульны сход работнікаў спецсаўгаса "Прыбярэзінскі", палiклінікі № 5, Дома культуры ААТ "Сілікат", СШ № 11 і школы-каледжа мастацтваў вылучыў кандыдатам у дэпутаты дырэктара ААТ "Бабруйскі завод вагавымяральных прыбораў" **В. Я. Чыстабаева.**

А вось на сходах працоўных калектываў калгаса "Гігант", Глускага раённага аб'яднання ЖКГ і Глускага раённага Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі кандыдатам у дэпутаты ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь вылучаны старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **А. К. Бабкоў.**

ДА АСОБНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ

У мэтах эканоміі паліва ва ўмовах абмежавання яго пастаўкі ў рэспубліку, з 2-га жніўня да асобнага распараджэння ўведзены рэжым абмежавання цеплавой энергіі з гарачай вадой для жыллёвага фонду і аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння, якія "запітаны" ад цэплацэнтраліі канцэрна "Белэнерга".

Як значыцца ў распараджэнні віцэ-прэзідэнта канцэрна "Белэнерга" В. Г. Кардубы, з 6 гадзін раніцы да 22 гадзін вечара тэмпература цеплаэнасіцеля на выхадзе ад ЦЭЦ і кацельняў павінна быць не ніжэй 52-53°С, а ў начны час падаецца па тэхналагічнаму мінімуму ці наогул адключаецца.

ПА БРУСНІЦЫ І ЖУРАВІНЫ

У Магілёўскай вобласці ўстаноўлены тэрміны збору брусніц з 19 жніўня і журавін – з 2 верасня.

Збор і нарыхтоўку брусніц і журавін, а таксама іншай дзікарослай прадукцыі суб'ектамі гаспадарання дазволена рабіць толькі па лясных білетах выдадзеных органамі ляснай гаспадаркі. Насельніцтву і суб'ектам гаспадарання пры зборы дзікарослай прадукцыі настойліва ўказваецца строга выконваць правілы пажарнай бяспекі.

У ПАЛОНЕ НЯПТУНА

За прайшоўшае паўгоддзе ў Магілёўскай вобласці цярпелі бедствы на вадзе 326 чалавек. На жаль, 54-х нашых суайчыннікаў так і не даваялося выратаваць. Праўда, годам раней гэтая лічба была куды большай. Амаль 100 чалавек забраў у "палон" цар Няптун.

Дзякуючы намаганням адпачываючых і работнікаў выратавальных пастоў Асвода давялося скараціць колькасць няшчасных выпадкаў на вадаёмах Бабруйска. У параўнанні з мінулым годам, калі вада пазбавіла жыццяў 22 бабруйчан, сёлета колькасць ахвяр скарацілася да 6 чалавек.

ДЭМАГРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ ПАГАРШАЕЦЦА

Змяненні жыццёвага ўзроўню насельніцтва, на што паўплывала сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў пачатку 90-х гадоў, прыкметным чынам адбіліся на пагаршэнні важнейшых паказчыкаў стану здароўя.

Сярэдняя працягласць жыцця ў мужчын скарацілася на 8-10 гадоў, а ў жанчын – на 5-8 гадоў. Калі ў 1991 годзе паказчык нараджальнасці складаў 13,6, а смяротнасць – 8,9 на 1000 жыхароў, то летась гэтыя лічбы апусціліся да рысы 9,54 і 10,68. Прырост насельніцтва за перыяд 1991-1999 гг. скараціўся з плюс 4,7 да мінус 1,13.

За вызначаны перыяд часу ў горадзе значна пагоршылася сітуацыя з распаўсюджваннем СНІДу, іншымі захворваннямі. Прыгоднасць прызыўнікоў да службы ва Узброеных сілах скарацілася з 92,9 да 71,7 працэнта. Прычынай таму – умовы працы і быту, спосаб жыцця людзей, а таксама – прыроднае асяроддзе. Змяніць сітуацыю да лепшага немагчыма ў рамках толькі адной галіны аховы здароўя. Тут патрэбна дапамога органаў дзяржаўнай улады ўсіх узроўняў. Менавіта аб гэтым ішла размова на чарговым пасяджэнні гарвыканкома падчас разгляду пытання "Аб гарадской праграме "Здароўе народа", якая разлічана на 5 гадоў і прадугледжвае выкананне шэрагу шматлікіх мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі, навакольнага асяроддзя, умоў працы, медыцынскай дапамогі і сацыяльнай падтрымкі.

Фінансаванне гарадской праграмы "Здароўе народа" будзе здзяйсняцца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту прадпрыемстваў і арганізацый.

"БАБРУЙСК – ЛЕТА-2000"

Сёння ў раёне вёскі Думаноўшчына разгорнуць свой палатачны гарадок удзельнікі турыстычнага злёту "Бабруйск – Лета-2000", ініцыятарам правядзення якога выступіў Бабруйскі гарком грамадскага аб'яднання "Беларускі патрыятычны саюз моладзі".

У праграме злёту, які будзе доўжыцца тры дні, – шматлікія спартыўныя спаборніцтвы і конкурсы.



СВЯТЛАНА ВАВУЛА ПРАЦУЕ НА "ВЫДАТНА"

Святлана Вавула працуе аператарам тэхнічнай канторы станцыі Бабруйск. У яе даволі адказная і клапатлівая праца, якая для недасведчаных людзей можа здацца нейкай дробяззю. Калі гэтакія ў чым сумняваюцца, то няхай прыйдуць ды папрацуюць з мноствам самых розных дзелавых папер і дакументаў, якія трэба давесці да ладу і да месца.

Ужо семнаццаць год мінула з тае пары, як Святлана Аляксандраўна прыйшла ў таварную кантору чыгуначнай станцыі. Спадабалася ёй у калектыве: побач працавалі добразычлівыя людзі, якія ахвотна дапамагалі, давалі парады. А прафесію чыгуначніка выбрала невыпадкова, бо яе маці ў свой час працавала дзяжурнай на чыгуначным пераездзе.

Размова ішла не толькі пра вытворчыя справы, а і пра мінулае, і пра сённяшняе. Святлана ўзгадвала сваю вёску Савічы, дзе нарадзілася, сям'ю, у якой жыла. Зайшла размова і пра яе ўласную сям'ю. Даведваюся, што Святлана Аляксандраўна нарадзіла траіх дзяцей, якіх трэба дагледзець, выхаваць і, як кажуць, у людзі вывесці.

Уладзімір НОВІКАЎ,
грамадскі карэспандэнт "Бабруйскага жыцця".

На здымку: *Святлана ВАВУЛА.*
Фота Аляксандра ФІСЕНКІ.

И СНОВА ЗВОНОК НА УРОК...

Вот и подходит к финишу лето. Еще несколько деньков и "возьмет власть в свои руки" осень. С этой порой связано немало...

1 сентября! День знаний! Для школьника это "второй Новый год". За лето девчонки и мальчишки подросли, загорели, отдохнули, и с новыми силами сядут за парты. Родители делают всё, для того, чтобы их "школяр" учился на "отлично": не жалея своих сил, отправляются на поиски школьных принадлежностей, одежды. Нелегко приходится в этой ситуации и детям: примерки, "приглядки" (повернитесь налево, направо). Изможденные, но с удачным "уловом", ребята возвращаются домой, немного отдохнув, целый вечер крутятся у зеркала. Они видят себя в полной "боевой" экипировке, "вооруженными до зубов" (карандаши, тетрадки, ручки и дневник...). Улыбочку, желательно счастливую, – и можно смело шагать в школу.

Не испортится ли это праздничное настроение к концу последней четверти?! Каким будет этот новый учебный год (кстати, "шагаем" в новое тысячелетие)?

По традиции, на все интересующие нас вопросы отвечает начальник управления образования Лидия Сергеевна БОГДАНОВА.

Л. С.: Уже который год главной проблемой являются педагогические кадры в городе. В этом году к нам направлено более 50 молодых специалистов, но "доедут" ли...Как всегда, "дефицит" на учителей иностранных языков, физической культуры, дефектологов, социальных педагогов. Приглашаем на работу учителей-пенсионеров. Я думаю, что к 1 сентября этот вопрос будет решен. И это никак не повлияет на учеников.

***Корр.:* Какова готовность школ, второго дома, принимать детей?**

Л. С.: В этом году, за летний период, в столовых помещениях восьми школ города было заменено технологическое оборудование, столовый инвентарь, некоторая мебель.

В частности, в школах был проведен косметический ремонт (в зависимости от необходимости: будь то ремонт в учебных классах, спортивных залах или же поменялся "внешний облик" школы).

***Корр.:* Лидия Сергеевна, сразу же напрашивается вопрос: как обстоят дела с финансированием в этом учебном году?**

Л. С.: Могло бы быть и лучше.. Финансируемся мы из местного бюджета. Помогают предприятия, организации. Но, несмотря на это положение "на плаву", мы не закрыли ни одной школы (и не будем!). Заработная плата и отпускные были выплачены. Мы не имеем больших долгов. Шефы помогают кто чем может. Нам удалось открыть несколько профилирующих классов, Центр реабилитации на базе детского сада... Хотелось бы, конечно, чтобы учителя не считали копейки, но это от нас не зависит.

***Корр.:* Сколько учеников в этом году встречает школа?**

Л. С. К сожалению, в этом году количество учеников снизилось на 1,5 тыс. человек. В школу пойдет 34 тыс. мальчишек и девчонок (общее количество). Но, повторяю, что мы не собираемся закрывать ни одного учебного заведения!

Такое снижение наблюдается не только в г. Бобруйске.

***Корр.:* Одним из "больных" вопросов является школьная форма (особенно для девчонок). Как должен выглядеть настоящий ученик?**

Л. С.: Как таковой, единой школьной формы нет. Образцы прошлых лет устарели, а нового мало. Мне понятна забота, головная боль родителей: во что "нарядить" своего ребенка.

Прежде всего, надо учитывать, что дети идут в школу, а не на дискотеку (об этом частенько забывают). Значит, внешний вид должен соответствовать положению. Для малышей это не составляет большого труда. А вот старшеклассникам тяжело, особенно девчонкам. Лучше всего это костюмы...

Главное – желание и фантазия (только в меру). Я понимаю родителей. "Сборы" в школу нынче дорогие (цены "кусаются").

***Корр. :* Лидия Сергеевна, еще одна забота – учебники! Во сколько они обойдутся родительскому кошельку?**

Л. С.: В этом году выпущено 117 наименований учебных пособий. Часть из них поступила в школьные библиотеки, другая – на прилавки магазинов. Труднодоступными для нас остаются книги российского издательства. Стоимость комплекта учебников достигает 2 тыс. рублей (в зависимости от класса). Это 25% от полной стоимости. Но предусмотрены некоторые льготы (16 категорий). Несомненно, в процессе учёбы потребуется новая дополнительная литература. Я считаю, что наши книжные магазины располагают пособиями по школьным предметам.

***Корр.:* Как будет организовано питание для детей в школах?**

Л. С.: Этот вопрос уже решен. Для малышей (группа продленного дня) питание бесплатное. Для старшеклассников – в зависимости от родительской доплаты. Выделяется некоторая сумма и из бюджета.

Меню будет составлено учитывая здоровье школьника (хронические заболевания). Предприятия школьного общепита "Купалінка" и "Белшина", делают все, для того, чтобы питание для детей было качественным и доступным.

Мы не забываем и о том, что дети много времени проводят в школе. Иногда они не завтракают дома, ничего "дополнительного" не берут с собой. В этом вина ложится на плечи родителей. Так они заботятся о здоровье своих чад. Порой не задумываются о том, что рабочий день взрослого в соотношении равен учебному дню школьника. А если ещё ребенок посещает факультативы, кружки...

***Корр.:* Лидия Сергеевна, спасибо за содержательный разговор.**

И в завершении мы хотим пожелать всем педагогам и ученикам крепкого здоровья, счастья,. поменьше проблем, успехов в новом учебном году! Чтоб всё в жизни у вас было только на "отлично"!

Елена ДЕМИДОВИЧ.

ДТП: СГОРЕЛО ДВА АВТОМОБИЛЯ

19 августа на ул. Нахимова произошло чрезвычайно крупное дорожно-транспортное происшествие. В результате "лобового" столкновения грузовых автомобилей марки ЗИЛ – произошло возгорание машин. К счастью, водители автомобилей не пострадали. А причиной столкновения послужил пьяный пешеход гражданин Н., объезжая которого, один из автомобилей, который двигался со стороны ул. Бахарова по ул. Нахимова выехал на полосу встречного движения. Автомобили сгорели практически полностью. Машины принадлежат гидролизному заводу, который понес многомиллионный материальный ущерб. А пешеход, гражданин Н., был отправлен в медвытрезвитель.

М. МИХАЙЛОВ.

Агляд прамысловасці

ЦІ ВЫЙДЗЕМ НА ПРАГНОЗНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ?

Апошнім часам у гарвыканкоме былі праведзены нарады з кіраўнікамі суб'ектаў гаспадарання і эканамічных службаў прамысловых прадпрыемстваў, дзе разгледжвалася пытанне аб выніках работы галін народнай гаспадаркі горада за першую палову года і задачах па выкананню прагнозных паказчыкаў на бягучы год. На іх было прынята рашэнне правесці аналіз выканаў вытворча-гаспадарчай дзейнасці за першую палову сёлетняга года з выяўленнем рэзерваў эканамічнага росту і паскарэння абароту капітала. На аснове аналізу эканамічным службам прадпрыемстваў было даручана прадставіць чакаемае выкананне асноўных прагнозных паказчыкаў на 2000 год з разбіўкай па месяцах.

У выніку 13 прадпрыемстваў горада па разліках не выходзяць на прагнозныя паказчыкі па выкананню аб'ёмаў вытворчасці. Сярод іх акцыянерныя таварыствы "Бабруйскі леспрамгас", "Сілікат", "Бабруйскі гармалзавод", арэнднае прадпрыемства "Бабруйскі завод буйнапанельнага домабудавання", прамысловае прадпрыемства "Заранка", завод зборнага жалезабетону № 2, камбінат жалезабетонных вырабаў, футравая фабрыка, піваварны завод, мясакамбінат, закрытае акцыянернае таварыства "Вірсаль", камбінат нятканых матэрыялаў.

І хаця за 7 месяцаў бягучага года аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі ў дзеючых цэнах склаў 114892 мільёны рублёў, а тэмп росту да адпаведнага перыяду мінулага года – 103,4 працэнта пры гадавым прагнозе 102,3 працэнта, чатыры галіны прамысловасці з шасці атрымалі прырост прадукцыі да адпаведнага перыяду мінулага года, усё ж шмат прадпрыемстваў знізілі аб'ёмы вытворчасці. Сярод іх прадпрыемствы дрэваапрацоўчай прамысловасці (96,8 працэнта) і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў (56,8 працэнта да адпаведнага перыяду мінулага года).

За студзень–ліпень адгружана прамысловай прадукцыі на 107420,1 мільёна рублёў, ці 93,5 працэнта ад выраблення. Аднак запасы гатовай прадукцыі на прадпрыемствах горада працягваюць павялічвацца. Калі на першае ліпеня бягучага года яе рэшткі да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці складалі 67,1 працэнта, то на 1 жніўня – ужо 68 працэнтаў.

Сярод прадпрыемстваў, якія перавысілі нарматыў рэшткаў гатовай прадукцыі, акцыянерныя таварыствы "Вагапрыбор", "ФанДОК", "Вірсаль", завод драўнінна-валакністых пліт, камбінат жалезабетонных вырабаў, футравая фабрыка, камбінат хлебапрадуктаў.

Значна пагоршыўся і фінансавы стан прадпрыемстваў. Балансавыя страты на пачатак ліпеня па прамысловасці склалі 4560,4 мільёна рублёў. Хаця колькасць стратных прадпрыемстваў за чэрвень скарацілася з 11 да 9.

Вельмі вялікая сума стратаў назіраецца ў акцыянерным таварыстве "ФанДОК", дзе яна вымяраецца ажно ў 6339,6 мільёнаў рублёў, і на буйнейшым прадпрыемстве горада – БШК "Белшына". На апошнім страты складаюць 2638,7 мільёна рублёў.

Па стане на 1 жніўня запазычанасць па ўсіх відах плацяжоў у прамысловасці склала 2926, 8 мільёна рублёў. Менавіта такія грошы прадпрыемствы запазычылі ў бюджэт, па зарплаце, за цеплаэнергарэсурсы і ў фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Цяжкі фінансавы стан прадпрыемстваў узмацняецца растучай крэдыторскай і дэбіторскай запазычанасцю. Так, крэдыторская запазычанасць на пачатак ліпеня складала 43028,6 мільёна рублёў і перавышае дэбіторскую ў 3,6 раза.

Што робіцца для таго, каб выправіць цяжкае становішча? Гарвыканкомам і ўпраўленнем эканомікі і рынкавых адносін прыняты шэраг мер, якія накіраваны на забеспячэнне эканамічнай стабільнасці народна-гаспадарчага комплексу і выкананне важнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця горада. У прыватнасці, была праведзена сумесная нарада кіраўніцтва гарвыканкома і канцэрна "Беллеспаперапрам" па выніках работы за першую палову года прадпрыемстваў, якія падначалены гэтаму канцэрну. Прынята рашэнне лічыць галоўнай задачай кіраўнікоў прадпрыемстваў і выканаўчай улады забеспячэнне безумоўнага выканання прадпрыемствамі прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця на гэты год.

Таксама было праведзена пашыранае пасяджэнне наглядальнага савета акцыянернага таварыства "Бабрускі рамонтна-механічны завод" з удзелам кіраўніцтва гарвыканкома, гарадскога Савета дэпутатаў, дзе былі вызначаны канкрэтныя захады па выхаду з цяжкага становішча.

Міхаіл КРЫВЕЦ.

С ПОЧТОВОЙ СУМКОЙ ПО ЖИЗНЕННОЙ ДОРОГЕ

Каждый из нас в общем-то знает формулу информационного обеспечения населения, которую вывели еще древние мудрецы: "Радостная новость ползет черепахой, а горькая – летит на крыльях". Знать-то знает, но в своей работе чаще других сталкивается с ней Валентина Константиновна Романюк. Дело в том, что она работает оператором 25-го почтового отделения и через ее руки проходят все радостные и горькие телеграммы, письма и переговоры от жителей Киселевич и к жителям этого района города.

И это только кажется людям непосвященным, что работа у оператора – позавидовать можно. На самом же деле Валентина Константиновна в одном лице объединяет и почтового работника — *принимая и передавая* телеграммы, переводы, обеспечивая переговоры, и плотника – орудуя молотком и пилой, заколачивая, запиливая и упаковывая, *согласно* правил, посылки и бандероли, и продавца – торгуя конвертами, открытками и так называемыми сопутствующими товарами, и даже целое справочное бюро — когда пожилым людям приходится помогать заполнять различные бланки и платежки по вечно меняющимся тарифам, и поэтому, выслушивая претензии, "отдуваться" за работу коммунальников, энергетиков, газовиков. Держать "ответ" почему на деньгах нули убрали, почему неправильно за квартиру насчитано, или с чем связан запрет денежных переводов в Россию. И приходится ей объяснять очень долго и терпеливо. Что это не почтовые работники запретили, насчитали, убрали. И не только людям пожилого возраста. Есть много молодых с амбициями, не хотят слушать, гнут свое, считают себя умнее всех.

— Но мы стараемся каждого успокоить. Внимательно выслушать, — говорит Валентина Константиновна, — ведь люди не виноваты в том, что такая жизнь тяжелая.

И вот в таком кипящем котле вот уже восемь лет работает эта миловидная женщина. А пришла она в Киселевичское отделение связи можно сказать случайно: с мужем — военным по переводу из Германии переехали в наш город, а тут и подвернулась эта работа.

Поначалу было нелегко, так как начинала простым почтальоном. Но зато сейчас Валентину Константиновну знают практически все семь с половиной тысяч жителей Киселевич, здороваются, интересуются делами. А тогда, восемь лет назад, взвалив на



плечи тяжеленную сумку, отсчитывая пройденные километры от дома к дому, от подъезда к подъезду, об этом как-то не думалось. Но было приятно, когда видела, что ее со свежими новостями ждут, встречают.

В каждую семью по две – три и больше газет, журналов носила, люди читали. Не то что сейчас, когда, по словам женщины, редко кто позволяет себе выписывать периодику. Хотя все же молодежь в основном читает "Комсомолку". Из журналов пользуются спросом издания детские, женские, для рукоделия, вязания. Городские газеты хорошо идут. Из республиканских – "Советская Белоруссия". Есть целые подъезды и даже дома, где живут люди старой закалки, которые подписываются только на эту газету.

А сама Валентина Константиновна отдает предпочтение газетам нетрадиционного направления, связанным с биоэнергетикой, например, таким, как "Чистый мир", чтобы отключиться от сегодняшнего дня, потому что, как она говорит, если вникать во все подробности политических нюансов и вообще всей нашей реальности, то очень тяжело жить.

— Да, раньше интереснее было работать, — вздыхает В.К.Романюк. – Сейчас люди позволяют себе в основном только поздравительные телеграммы, да и то не часто, так как дорого. И письма сейчас плохо ходят, бывает, что по два месяца в пути. Не сравнить с началом моей работы. Помню, перед 8-м Марта или 23-м февраля работало по два телеграфиста и не справлялись. Передавали и принимали по сто с лишним телеграмм. Доставщики буквально с ног валились. А сейчас если телеграмм тридцать перед праздником примем, так уже наплывом считаем.

Но зря грустит Валентина Константиновна. Работы ей и пяти ее коллегам хватает и сегодня. Как-никак, а на весь городок всего одно почтовое отделение. Так что бывает и головы женщинам поднять некогда. Ведь это не шутка обслужить в день более 500 человек.

Среди серых будней настоящим праздником для Валентины Константиновны было участие в двух конкурсах профессионального мастерства — областном и республиканском.

— Получилось так, что в городском я заняла первое место, — вспоминает она. – В Могилеве соревновались в приеме посылок, переводов, телеграмм. Держали теоретический экзамен. Мне улыбнулась удача и — второе место в конкурсе. Но больше всего понравилось в Минске. Обстановка была доброжелательная. Приехали представители со всех областей. Мы *смотрели как работают люди* и что они умеют, учились у них и показывали, на что способны сами. Общались между собой. К сожалению, я немножко растерялась и уступила в практическом упражнении, а по теории у меня было отлично. В итоге заняла четвертое место. А как после конкурса меня дома встречали муж и дочушки...

Каждый день в троллейбусе, магазине, на почте мы сталкиваемся с десятком людей, и ... не замечаем их, принимаем как должное, потому что настолько привыкаем к их необходимости быть с нами рядом. А ведь среди них есть такие интересные люди, как Валентина Константиновна Романюк.

Валерий ЗИНОВСКИЙ.

Фото Александра ФИСЕНКО.

Служба информации "БЖ"

"ЗАЙЧИКИ", ПОКУПАЙТЕ ТАЛОНЫ ЗАРАНЕЕ

Какую ответственность несет пассажир, если он проехал в троллейбусе без билета только одну остановку (к тому же билеты отсутствуют в продаже у водителя)?

Н. Зотова.

На этот вопрос отвечает начальник отдела доходов троллейбусного управления **М. Н. КУКСИЦКАЯ**:

– Безбилетным считается пассажир, вошедший в салон троллейбуса и до следующей остановки не закомпостировавший талон, равно как и не предъявивший в момент проверки. В этом случае человек обязан оплатить штраф в размере 0,5 минимальной заработной платы (на данный момент сумма составляет 1300 рублей).

Водитель троллейбуса не несёт ответственность за отсутствие талонов в продаже, т. к. талоны имеются в ограниченном количестве.

КУДА СДАТЬ ЯБЛОКИ?

У меня в этом году богатый урожай яблок. Подскажите, на каком из предприятий производится закуп фруктов у населения?

Раиса Николаевна Коваленко, пенсионерка.

Действительно, в этом году фруктовый урожай выдался на славу. "Проспонсировав" своих родных и близких, люди ищут места сбыта яблок. Вот тут-то и возникают проблемы: где, куда, по сколько .

От частных лиц яблоки принимает ОАО "Бобруйский консервный завод". 1 кг яблок (летние сорта) стоит 35 рублей. Отметим, что предприятие производит расчет не наличными деньгами, а своей готовой продукцией (повидло, томатный сок, консервируемые овощи).

ДОМАШНЯЯ "КОРЗИНКА"

Сколько составляет прожиточный минимум для семьи из четырех человек?

Александр В., глава семейства.

Бюджет семьи из четырех человек на август составлял 45898 рублей в месяц (прожиточный минимум).

Из них на питание приходится 57,7%, одежда, белье, обувь – 199%, предметы хозяйственного (бытового) назначения – 7,7%, санитарно-гигиенические принадлежности и лекарства – 3,3%, оплата за жильё и коммунальные услуги – 3,5%, бытовые услуги и транспорт – 5,1%.

УМЕНЬШЕНИЕ АЛИМЕНТОВ – РЕАЛЬНО?

Я живу в повторном браке. Недавно родился у нас ребенок. Имею ли я право подать исковое заявление в суд на уменьшение размера алиментов?"

Олег К., военнослужащий.

Отвечает государственный нотариус **О. В. СИНЯВКИНА**:

– Да. В соответствии с Кодексом РБ у вас есть такая возможность.

По месту жительства

ЧТОБЫ ОТДЫХ БЫЛ ИНТЕРЕСНЫМ

Лето – прекрасная пора для отдыха детей и подростков. Педагогический коллектив клуба для детей, подростков и молодёжи "Азимут" ЖЭУ-3 Ленинского района, а также детский актив клуба делают всё возможное, чтобы отдых ребят был интересным и разнообразным.

На одной из игровых площадок, расположенных на территории ЖЭУ-3, на ул. Чонгарской, 81/25, в благоустроенном дворике для всех желающих организуются веселые игры, соревнования и конкурсы. Больше всего ребятам запомнился праздник "Весёлые каникулы". С азартом участвовали подростки в играх "Не зевай", "Поле загадок", "Шуточная олимпиада", "Выиграй приз" и других.

С большим интересом участвовали ребята в викторине "Наш город", подготовленной работниками библиотеки № 6, и в беседе, которую провели старший инспектор ИДН Ленинского РОВД Н. Н. Будник и участковый инспектор В. А. Радзевич. *Особой популярностью* пользовалась игра "Угадай мелодию", подготовленная членами кружка "Игры и досуга", – настоящий праздник веселья, шуток, смеха.

Не раз встречались ребята с председателем Совета ветеранов ЖЭУ-3 В. Ф. Гавриленко.

Дружат в клубе со спортом и туризмом. *Раз в неделю* ребята могут принять участие в спортивных соревнованиях между клубами ЖЭУ Ленинского района "Вас вызывает Спортландия".

В июне члены туристического кружка защищали честь клуба на районном туристическом слёте, а в июле были участниками областного туристического слёта, организованного областным комитетом БПСМ.

А. КАПУСТИНА, педагог-организатор.

ДОБИЛИСЬ ПОЛОЖИТЕЛЬНЫХ РЕЗУЛЬТАТОВ

Известно, что обеспечение безопасных и здоровых условий труда и осуществление мероприятий по предупреждению травматизма и заболеваемости на производстве способствует более успешному выполнению производственных задач.

В последнее время стало больше внимания уделяться вопросам охраны труда и профилактике производственного травматизма. На многих предприятиях укреплена служба по охране труда, организовано необходимое обучение работников по этому вопросу. Райисполком и горисполком рассмотрели вопросы состояния охраны труда, а также материалы специальных расследований несчастных случаев с тяжелыми последствиями.

Анализ производственного травматизма за первое полугодие 2000 года показывает, что по сравнению с аналогичным периодом 1999 года общее количество несчастных случаев с тяжелыми последствиями снижено на 17,2%. Соответственно показатель частоты составил 1,1 против 1,3 за 1-е полугодие 1999 года. На 7% снижена потеря рабочих дней в связи с производственным травматизмом. Однако эти результаты не должны успокаивать и приводить к ослаблению внимания в вопросах безопасности труда.

В 1-м полугодии 2000 года по г. Бобруйску государственными инспекторами Бобруйской межрайонной инспекции труда по результатам проверок выдано 191 предписание нанимателям для устранения 4282 нарушений правил и норм охраны труда, приостанавливалась работа 242 единиц оборудования до приведения их в соответствие с действующими правилами и стандартами. Таким образом, необходимо дальнейшее улучшение работы по охране труда и обеспечение безопасности на производстве.

В. ЛИТКОВСКИЙ, начальник Бобруйской межрайонной инспекции труда.

Время и нравы

ПОНО... ЖЕНЩИНА:
холодное оружие в нежных руках

В наш странный век, когда многое перевернулось с ног на голову, извратились святые понятия родной земли, веры, семьи, любви, иным стало и понятие "женщина". Вместо смирения, нравственной чистоты и нежности время зачастую открывает нам совсем новые черты женской натуры: карьеризм, разнузданность или нахальство.

"Cosa del a vita", – говорят итальянцы – "такова жизнь". Она ломает узкие стереотипы, заставляет по-другому смотреть на мир. Многое в поведении современных "барышень" и "дам бальзаковского возраста" можно оправдать неумолимым бегом секундной стрелки перемен по циферблату человеческой истории. Мы ко многому уже привыкли. И тем страшнее то, на что мы смотрим уже без "первородного" страха: ежедневные террористические акты, убийства, изнасилования до смешного естественны в сознании общества. Преступность прочно вошла в нашу действительность – необъявленная война мужчин с миром. И тем страшнее то, что к ней всё чаще и чаще подключаются те, кому самой природой отведена роль хрупких, беззащитных существ – женщины. Так, лезвие ножа в нежных руках нередко становится не только средством обороны, но и отличным оружием в выяснении отношений с противоположным полом. Подобные выводы сами собой просятся у меня после разговора с помощником председателя суда Ленинского района города Бобруйска Валерием Павловичем Кожевниковым. С его помощью у меня была возможность ознакомиться с материалами трех "женских" уголовных дел (только за последние два месяца), где фигурирует статья 106-я уголовного Кодекса Беларуси – нанесение тяжких телесных повреждений. О них хочу вам рассказать. Итак...

ДЕЛО ПЕРВОЕ

"Героиня" – двадцатисемилетняя Татьяна Скворцова. После совместного распития пяти бутылок вина с соседями на почве ревности она чуть не убила собственного мужа Сергея, нанеся ему обыкновенным кухонным ножом колото-резаные раны в шею и бок. Потерпевший претензии к разбуянившейся супруге предъявлять не стал, и суд приговорил Татьяну всего к трем годам лишения свободы условно (с испытательным сроком в один год).

ДЕЛО ВТОРОЕ

У него долгая предыстория. Светлане Величко не повезло с детства – её отца и мать в свое время лишили родительских прав. Какой-то период девочка жила под опекой бабушки, потом отец Виктор Величко забрал ее к себе в новую "семью". Сам он, дважды судимый за кражу и незаконное хранение оружия, особой нравственностью, как вы сами понимаете, не отличался и ничему хорошему научить дочь не смог.

Света поступила в СПТУ-145, но после первого курса "вылетела" за пропуски, пьянство и грубое поведение с мастерами и преподавателями. Потом, учитывая её тяжелое материальное и семейное положение, Величко взяли назад. Доучиться она всё-таки смогла и даже некоторое время работала на "Славянке"... А в конце 1998-го Светлана получила один год условно за кражу. Позаимствовать вещи Величко решила из квартиры Александра Литвинчука, своего сожителя. Ему же, "от большой любви", в декабре того же 1998-го девушка ножом нанесла проникающее ранение в брюшную полость с ранением печени. Этот инцидент всплыл уже в этом году, когда Светлана Величко была арестована за убийство отца. В 98-м она и Саша изобразили случай с Литвинчуком, как нападение неизвестных. Истинные же обстоятельства выяснились в ходе следствия по обвинению Светы в умышленном убийстве (по 101-й статье УК РБ). В состоянии алкогольного опьянения сувенирным ножом она ранила своего непутевого отца практически в самое сердце. На больничной койке реанимационного отделения Виктр Величко скончался.

Приговор суда Светлане – тринадцать лет лишения свободы с принудительным лечением в местах заключения: врачи признали у 21-летней Величко первую стадию алкоголизма.

ДЕЛО ТРЕТЬЕ

На оглашении приговора по делу восемнадцатилетней Наташи Рыжовой я присутствовала лично. Статья все та же – 106-я – нанесение тяжких телесных.

На скамье подсудимых – миловидная блондинка с прекрасными светлыми глазами. Выглядит, правда, далеко не на свои годы – на вид 25-27 лет. В зале: её мать, бабушка...Чернявый парень – потерпевший Дима Соловей – большая Наташина любовь. Сидит отвернувшись от нее, на реплики родных Рыжовой в свой адрес не реагирует. Еще будучи несовершеннолетней, девушка долгое время жила с ним. Потом Дмитрий её бросил – нашел другую. Об этом постоянно твердила Наташкина бабушка (по делу подобные сведения не проходили).

Рыжова тоже подобрала Соловью замену – новый кавалер содержал юную Наташу, которая нигде не работала, а из училища была отчислена за "подвиги" – все те же пропуски занятий и вызывающее поведение (материалы следствия). Но Диму, как я поняла, она не забыла. Видимо, хотела вернуть. От больших чувств не сдержалась – порезала бывшего "дружочка".

Некоторые обстоятельства этого случая до сих пор остаются неясными: была ли Наташа действительно трезвой, как утверждает она сама и свидетель и что отрицает потерпевший; что послужило истинной причиной такой вспышки гнева: на данные вопросы и Рыжова, и Соловей ответить не могут – скорее всего не захотели выносить личные отношения на всеобщее обозрение... А суд признал Наташу виновной и приговорил ее к трем годам тюрьмы.

...В зале я видела слёзы на прекрасных светлых глазах. Большая любовь?..Дима...Сразу после оглашения приговора его будто ветром сдуло. Совесть?..

18, 21, 28... Во всех трех историях – молодые женщины. Во всех трех фигурирует спиртное. Во всех трех – холодное оружие. А виновато... время. Пришла пора платить за совершенные ошибки. Волна насилия захлестнула страну. Газеты, телевидение, книги – везде одно и тоже: поножовщина, море крови, смерть. Мужчины воюют. Женщины насмотрелись. Настало время попробовать самим. Привыкнем ли мы к оружию в женских руках так же, как мы привыкли к нему в мужских? Или еще не поздно что-то исправить в нас самих, что-то предпринять?

Если только не поздно...

Марина САКАДЫНЕЦ.

P. S. *В силу этических соображений все имена и фамилии в указанных уголовных делах изменены.*

ШЧОДРЫЯ ДАРЫ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

1. Як захаваць вітаміннае багацце?

Даўно не было на нашым базары і міні-рынках, што месцяцца ля харчовых магазінаў, такога багацця бульбы, гародніны і садавіны, як сёлета. Радуюць вока на базарных прылаўках груды бульбы, памідораў, гуркоў, кабачкоў, капусты, морквы, цыбулі, яблык, ігруш, сліў і алычы. На міні-рынках ужо не хапае для прыватных гандляроў месцаў пад навесамі, і яны выкладваюць свой тавар побач, на усяляких прыстасаваннях. Знамянальна, што сёлетняя маладая бульба ў большасці сваёй разварыстая, смачная. Паесці яе са шкваркай і маласольнымі агурочкамі – адна асалода!

І гэта багацце даступна кожнаму па кошту. Напрыклад, кілаграм яблык можна купіць утрая танней за шклянку сланечнікавых семак. Прадаўцы нават гатовыя значна ўступіць у цане, толькі б вы што-небудзь купілі ў іх. Адным словам, бяры – не хачу.

Прыемна і тое, што нашыя фрукты прыкметна пацяснілі дарагакаштуючыя заморскія экзоты і еўрапейскую садавіну, якія, шчыра кажучы, за зіму і вясну надакучылі нам. Нават дзеці аддаюць зараз перавагу не апельсіну ці ківі, а нашаму свежаму, сакавітаму яблыку або грушы. А калі б не надзвычай танная мясцовая садавіна, хіба каштавалі зараз раннія астраханскія кавуны 180 рублёў за кілаграм? Хаця і гэта не вельмі танна. Дарэчы, не такім ужо ажыятажным попытам яны карыстаюцца. Людзі больш ахвотна купляюць "белы наліў", "шампанку", "малінаўку", "баравінку", "пуцінку", "каштэлю" і іншыя яблыкі, салодкія і духмяныя, вельмі прывабныя на выгляд знакамітыя гатункі груш "банкрот", "бэру летнюю", "лясную прыгажуню", "панну", "дзюшэс".

І усе, хто гандлюе садавінай – гараджане і вяскоўцы – у адзін голас сцвярджаюць, што ў іх садах галінкі дрэў гнуцца пад цяжарам пладоў і прызнаюцца, што не ведаюць, як захаваць ураджай.

Так, сапраўды гэтая акалічнасць засмучвае і пакупнікоў вітамінай прадукцыі. Раніцай купіш яблыкі ці грушы, а да вечара яны пакрываюцца плямамі. Рэдка якія вытрымліваюць некалькі дзён лёжкі, нават у халадзільніку ці ў склепе. Таму няма сэнсу стварць хаця б невялікі запас. Той, хто мае магчымасць, нягледзячы на высокія цэны на цукар, кілаграм якога абыходзіцца прыкладна ў 10 разоў даражэй за кілаграм садавіны, варыць варэнне, джэмы, гатуе сокі і розныя настойкі, віно. А што рабіць маламаёмным, якія складаюць значную частку насельніцтва?

А хутка ж сваё ганаровае месца на базарных прылаўках зоймуць царыца яблык – "антонаўка", "добры селянін" і іншыя позняя гатункі яблык. Куды ўсё гэта падзяваць?

Любуючыся шчодрымі дарамі нашай зямлі, з горыччу думаеш аб тым, што праз якія-небудзь паўтара, ад сілы два месяцы усё менш на базары ўбачыш такое багацце, і цэны на яго ўзнімуцца ўгору. І тады зноў базар запалоняць чужыя плады...

Няўжо і сёлета "Гарплодагароднінагандаль" не здолее нарыхтаваць на восень і зіму неабходную для гараджан колькасць садавіны, прычым не абы якой, як бывала раней, а добрай, самых лепшых гатункаў? Магчыма, для гэтага спатрэбіцца банкаўскі крэдыт і дапамога гарадскіх улад, але вырашаць застарэлую праблему неабходна.

І яшчэ. Ёсць апасенне, што нават пры такім багацці і дзешавізне садавіны наш завод напіткаў і іншыя перапрацоўчыя прадпрыемствы харчовай прамысловасці будуць прадаваць сокі і іншую пладовую прадукцыю па астранамічных цэнах. Калі такое здарыцца, яно будзе незразумелым і недаравальным. Сокі ў нашых экалагічных умовах павінны быць на стале кожнага бабруйчаніна і вяскоўца жыхара.

І яшчэ думаеш вось пра што.

Колькі можна Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання рабіць выгляд, што яно не заўважае, у якім заняпадзе на працягу дзесяцігоддзяў знаходзіцца нашае садоўніцтва? Колькі можна гаварыць і пісаць аб карысці для чалавека садавіны і ў той жа час нічога не рабіць для таго, каб выправіць становішча? Хіба беларуская зямля горшая, чым у Польшчы, адкуль гандлёвыя арганізацыі і так званыя прыватныя прадпрымальнікі прывозяць сюды позняй восенню і зімой дарагакаштуючыя фрукты, што, дарэчы, значна ўступаюць нашым па сваіх смакавых якасцях? Між тым кожнаму зразумела, што пры належнай арганізацыі справы Беларусь можа не толькі амаль круглы год забяспечваць сваё насельніцтва уласнай садавінай, але і ў шырокіх маштабах экспартаваць яе, атрымліваючы ад гэтага адчувальную выгоду.

Становішча па нашай просьбе тлумачыць начальнік Бабруйскай раённай станцыі аховы раслін Аляксандр Іосіфавіч Лашкевіч:

– Бяда ў тым, што ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах даўно глядзяць на садоўніцтва, як на бесперспектыўную галіну, якая мала што дае гаспадаркам. Вялікі ўрон садоўніцтву наносіць немагчымасць знайсці рынкі збыту, а таксама кліентаў, якія б маглі самі вывозіць вітамінную прадукцыю. Калі ж рабіць гэта з дапамогай транспарту калгасаў і саўгасаў, то кошт перавозак выльецца ў такія сумы, якія зробяць садоўніцтва стратным.

Таму з года ў год паўсюдна скарачаюцца плошчы пад садамі.

Значную частку ґатункаў садавіны, што вырошчваюць калгасы, саўгасы і прыватнікі, у тым ліку дачнікі, складаюць гатункі, якія даўно ўжо аджылі сваё, генетычна не прыстасаваны да цяперашніх умоў выжывання, нездольныя супрацьстаяць пладовым хваробам і шкоднікам, а таму непрыгодныя нават для непрацяглага захоўвання. Напрыклад, тая ж славутая "антонаўка", якую мы ўсе так любім, вытрымлівае лёжку толькі да лістапада. Трэба выводзіць новыя гатункі садавіны і адначасова адбіраць для шырокага культывавання тыя з іх, якія станоўча зарэкамендавалі сябе. Менавіта так робяць на Гродзеншчыне і Брэстчыне, у Польшчы і краінах Балты. Між тым у штатах гаспадарак і нават нашага ўпраўлення не прадугледжана пасада агранома-садавода.

Што датычыць прыватных уладальнікаў садоў, то яны наогул маюць вельмі цьмянае ўяўленне аб сучаснай тэхналогіі вырошчвання садавіны, карыстаючыся па старынцы дзедаўскімі метадамі, не ведаючы, якія прэпараты трэба набываць для аховы садоў і як іх ужываць. Няма і такой спецыяльнай службы, якая б на месцах абслугоўвала сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і прыватны сектар. Дарэчы, далёка не кожны пенсіянер знойдзе сродкі на пакупку сродкаў аховы садовых насаджэнняў. У сувязі з гэтым работнікі нашай станцыі гатовы бясплатна даваць любую кансультацыю індывідуальным садаводам. Наша станцыя знаходзіцца ў 25-м і 36-м кабінетах на трэцім паверсе будынка Бобруйскага райвыканкома (вул. Пушкіна, 215). Тэлефоны 7-76-81 і 7-38-51.

Хачу звярнуць увагу на тое, што генетычна ўстойлівыя да хвароб і добрыя ў лёжцы гатункі яблык і груш можна набыць у Жыліцкім саўгасе-тэхнікуме. На жаль, яго паслугамі мала хто карыстаецца.

Ад газеты заўважым, што Мінсельгасхарчу даўно пара павярнуцца тварам да садоўніцтва і разам з зацікаўленымі бакамі заняцца аднаўленнем і развіццём гэтай занядбанай галіны.

2. Будзем з хлебам і бульбай

А цяпер паспрабуем задаволіць зразумелую цікавасць нашых чытачоў адносна ўраджаю збожжа на Бабруйшчыне. Гэта тым больш важна, што ўмовы надвор'я зімой і сёлетняй вясной усялялі непакой за яго лёс. Вось што распавяла карэспандэнту "БЖ" галоўны аграном упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Бабруйскага райвыканкома Маргарыта Мікалаеўна Бандарчук:

– Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых у нашым раёне трэба разглядаць як нядрэнную. У сярэднім у гаспадарках намалочваюць іх звыш 22 цэнтнераў з гектара. Нагадаю, што летась было атрымана толькі па 15 цэнтнераў. Знамянальна, што сёлетні паказчыкі мала адрозніваюцца ад запланаваных.

У шэрагу гаспадарак ураджай яшчэ вышэйшы. Так, у калгасе "Гігант" кожны гектар дае амаль па 39 цэнтнераў збожжавых, а ячменю і аўса – амаль па 47 цэнтнераў, яравой пшаніцы – 35 цэнтнераў, азімай – больш за 32 цэнтнеры.

Другім пасля "Гіганта" ідзе па ўраджайнасці калгас імя Някрасава, дзе збор зерня склаў па 34,4 цэнтнера з гектара, трэцім – калгас імя Дзяржынскага – 32,4 цэнтнера. За ім ідзе калгас імя Аляксандра Неўскага – звыш 29 цэнтнераў з гектара. Канчатковыя вынікі будуць падведзены пасля заканчэння жніва.

